І. Б. Лапцёнак

# Адукацыйная роля музеяў у кантэксце рэалій сучаснай культуры
## (па выніках міжнароднай сустрэчы экспертаў краін СНД)

*У артыкуле разглядаюцца пытанні выпрацоўкі стратэгіі развіцця музейнай справы і абагульнення рэкамендацый Першай экспертнай сустрэчы вядучых музейных спецыялістаў краін СНД «Роля музеяў у адукацыі і развіцці культурна-пазнавальнага турызму». Значная ўвага надаецца праблемам укаранення інавацыйных практык у музейную дзейнасць, стварэння неабходнай інфраструктуры для развіцця музейнага турызму, фарміравання візуальнай і медыякультуры, распрацоўкі сістэмы комплекснага ўзаемадзеяння музеяў і ўстаноў адукацыі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе ва ўмовах культурнай разнастайнасці, у працэсе змянення эканамічных вектараў функцыянавання краіны, развіцця сацыякультурнай сітуацыі адбываецца кардынальная змена прыярытэтаў музейнай палітыкі. На працягу апошняга дзесяцігоддзя назіраецца паступовы і, разам з тым, імклівы пераход да мадэлі адкрытага музейнага асяроддзя.

У сусветнай культурнай прасторы адбываецца мадэрнізацыя дзейнасці музеяў: трансфармуецца музейны прадукт, набываюць вядомасць новыя прынцыпы праектавання, змяняюцца маркетынгавыя тэхналогіі. Аналіз дынамікі музейных прадуктаў, разгляд стратэгій камунікацыйных працэсаў у кантэксце мадэрнізацыі музейнай дзейнасці шырока прадстаўлены ў даследаваннях С. Андрэева, Ф. Котлера, Б. і Г. Лорд, А. Марье, А. Паповай, Ф. Рыбакова, Г. Тульчынскага, К. Хадсана і інш.

Асаблівую актуальнасць набываюць сёння пытанні адукацыйнай ролі музеяў у кантэксце рэалій сучаснай культуры, эфектыўнага выкарыстання музейных рэсурсаў для развіцця ўстойлівага і збалансаванага турызму, уключаючы інфармацыйныя і камп'ютарныя тэхналогіі, праблемы актуалізацыі музейных ведаў і калекцый для наведвальнікаў розных узроставых і сацыяльных катэгорый, інавацыйныя формы работы з наведвальнікамі, якія прадстаўляюць магчымасці для творчасці, пашырэння ведаў і міжкультурнага дыялога.

Музейная ўстанова перастае быць рэпрэзентантам мінулага, у працэсе сваёй дзейнасці яна імкнецца да выканання актуальных патрэб сучаснага грамадства. Прымаючы на сябе новыя функцыі, музеі ўваходзяць у высока канкурэнтнае асяроддзе, у якім ад разнастайнасці і якасці музейных прадуктаў залежыць будучыня музеяў.

Трансфармацыя акцэнтаў музейнай палітыкі ўплывае і на змяненне прынцыпаў кіравання, падыходаў да арганізацыі музейнай дзейнасці, вызначэння прыярытэтаў. З часам усё больш яскравай становіцца дыхатамічная аснова музейнага функцыянавання, больш рэзкім — разрыў паміж музеефікацыяй і дэмакратызацыяй музейнага асяроддзя. Усё гэта ўплывае на ўзнікненне завуаліраваных супярэчнасцей у выбары прыярытэтаў развіцця: «Музеі павінны заставацца вернымі сваім асноўным традыцыйным каштоўнасцям і ўдзяляць асноўную ўвагу захаванню і павелічэнню калекцый, якія з'яўляюцца матэрыяльнымі помнікамі культуры і акаляючага асяроддзя той тэрыторыі, на якой размешчаны музей… Але сучасны музей павінен таксама ўдасканальваць якасць

сваіх паслуг для шырокай публікі, уключаючы школьнікаў, студэнтаў ВНУ, звычайных наведвальнікаў з ліку мясцовых, замежных і нацыянальных турыстаў альбо спецыялістаў-даследчыкаў» [3, *VII*]. Адукацыйная і рэкрэацыйная функцыі пачынаюць пераважаць над асновамі традыцыйнай музейнай работы. У сувязі з гэтым растуць патрабаванні да стандартаў музейнай дзейнасці, змяняюцца акцэнты ў ключавых аспектах кіравання музеем.

Праблема перагляду тэхналогій кіравання на працягу апошняга часу неаднойчы знаходзілася ў полі зроку міжнародных экспертаў у галіне музейнай справы.

У 2008 г. у Мінску стартаваў пілотны праект па правядзенні рэспубліканскіх і нацыянальных трэнінгаў па музейным менеджменце для спецыялістаў дзяржаў–удзельніц СНД па ініцыятыве Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва (МФГС) і Міжнароднага Савета Музеяў (ICOM). Мэтай праграмы з'яўлялася павышэнне творчага патэнцыялу ў галіне музейнай дзейнасці, укараненне прафесійных стандартаў музейнай работы праз абмен ведамі і вопытам на міжкультурным і міжнацыянальным узроўні. У рамках Рэгіянальнай канферэнцыі, арганізаванай для музейных спецыялістаў краін СНД абмяркоўваліся праблемы ўдасканалення метадалогіі ўпраўлення, актывізацыі супрацоўніцтва музеяў і музейных работнікаў, укаранення інавацыйных практык і прафесійнай падрыхтоўкі персаналу [1, *10*].

Сёння своеасаблівым метадалагічным арыенцірам для выпрацоўкі стратэгіі развіцця музейнай справы з'яўляюцца вынікі Першай экспертнай сустрэчы вядучых музейных спецыялістаў краін СНД «Роля музеяў у адукацыі і развіцці культурна-пазнавальнага турызму», якая адбылася ў Кіеве ў 2011 г. і была прымеркавана да правядзення VI Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў–удзельніц СНД. У сустрэчы прынялі ўдзел спецыялісты ў галіне музейнага менеджменту Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана і Украіны.

***Для таго, каб забяспечыць рэальную пазітыўную дынаміку развіцця музейнай справы сёння толькі ахоўнай альбо экспазіцыйнай ролі для выкання місіі музея ўжо недастаткова. У сучасных умовах патрэбна шырокае ўвядзенне адукацыйных рэсурсаў, іншыя эканамічныя падыходы, звязаныя з камерцыялізацыяй культуры.***

Пытанні ўмацавання іміджу музеяў на прасторы СНД, захавання помнікаў сусветнага значэння, пашырэння турызму на аб'ектах агульнай гісторыка-культурнай спадчыны займаюць сёння передавыя пазіцыі. Яны патрабуюць прыняцця прадуманых упраўленчых рашэнняў, правядзення аналітычных даследаванняў з улікам сусветнага вопыту і дзяржаўнай падтрымкі.

Шырокае развіццё культурна-пазнавальнага турызму для садружнасці краін яшчэ фактычна не мае неабходнай інфраструктурнай і лагістычнай базы, якую можна было б лёгка выкарыстоўваць. Актуальнымі пытаннямі працягваюць заставацца распрацоўка турыстычных маршрутаў на прасторы СНД, развіццё музейнага турызму, паляпшэнне сэрвісу. Не менш актуальным з'яўляецца змястоўнае напаўненне — пашырэнне нацыянальнай праблематыкі, павелічэнне інтэрактыўных форм работы з турыстамі (укараненне гістарычных рэканструкцый, тэатралізаваных мерапрыемстваў, квэст-гульняў і інш.). Неабходна далейшае паглыбленне ролі музеяў у жыцці грамадства, стварэнне такіх умоў для развіцця і наведвання музеяў, якія дазволяць прэзентаваць музей як візітную картку краіны альбо горада, павялічыць адукацыйную ролю музеяў у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, збалансаванага турызму, паляпшэнні якасці музейнага жыцця.

Сучасны этап развіцця грамадства характарызуецца ўсё больш узрастаючай дынамікай інфармацыйных працэсаў, пашырэннем альтэрнатыўных магчымасцей асобы ў працэсе пазнання і адносін з акаляючым светам. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае духоўна-маральны і інтэлектуальны патэнцыял, які з'яўляецца важным фактарам развіцця нацыі. У гэтым плане музеі адкрываюць шырокія магчымасці: праз артэфакты гісторыі і сучаснасці яны прадстаўляюць культурную спадчыну, а асаблівасці музейнага вымярэння дазваляюць прэзентаваць яе глыбей і паўней, чым сродкамі традыцыйнай адукацыі.

І таму роля музея ў развіцці духоўнасці нацыі, раскрыцці творчых магчымасцей асобы набывае асаблівы сэнс, адкрывае новыя перспектывы, уплывае на спецыфіку задач і метадаў кіравання: «Кіраванне музеямі — вельмі дынамічны працэс, які залежыць не толькі ад менеджарскіх падыходаў і структур, але і ад узаемадзеяння музея з грамадствам у самым шырокім сэнсе гэтага слова» [2, *44*].

Музей з'яўляецца той інстытуцыяй, якая дапамагае фарміраванню асобы, яе здольнасцей інтэграваць культурны вопыт у кантэкст уласнага жыцця. Але далёка не ўсе адэкватна ўспрымаюць важнасць ролі музея ў выхаванні і адукацыі грамадства. Звязана гэта і з новай тэндэнцыяй да разумення музея як цэнтра рэкрэацыі.

Для таго, каб забяспечыць рэальную пазітыўную дынаміку развіцця музейнай справы сёння толькі ахоўнай альбо экспазіцыйнай ролі для выкання місіі музея ўжо недастаткова. У сучасных умовах патрэбна шырокае ўвядзенне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыйных рэсурсаў, іншыя эканамічныя падыходы, звязаныя з камерцыялізацыяй культуры. Узнікае заканамернае пытанне: наколькі гатовы да такой трансфармацыі супрацоўнікі музеяў? Для аб'ектыўнасці трэба адзначыць, што стэрэатыпы працягваюць займаць сваю нішу. Да новых форм пакуль што гатовы не ўсе. Задача супрацоўніка культурна-адукацыйнага аддзела сёння — граматна інтэрпрэтаваць музейны прадмет, у яркай вобразнай форме данесці інфармацыю ў інтэрактыўнай форме, выкарыстоўваючы не толькі шырокую інфармацыю па профілі дзейнасці, але і навыкі арганізацыі работы з нефармальнымі матэрыяламі, псіхолага-педагагічныя веды для работы з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў, у тым ліку і па арт-тэрапеўтычных методыках.

Апошнім часам мы шмат гаворым пра ўвядзенне інтэрактыўнасці ў музейную дзейнасць. Колькасць мерапрыемстваў і працягласць работы музея не з'яўляюцца сведчаннем яго запатрабаванасці. Музей павінен быць мабільным, дынамічным і дэмакратычным. Лепшы паказчык — аўдыторыя, якая прыходзіць у музей з задавальненнем. Многае залежыць і ад таго, наколькі музей «малады» па духу — мабільнасць супрацоўнікаў, крэатыўнасць праектаў, удзел моладзі ў арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў. Адметны вопыт сярод краін СНД па распрацоўцы і шырокім укараненні ў музейнае асяроддзе новых форм работы прадстаўляе сёння Маладзёжны цэнтр Дзяржаўнага Эрмітажа (РФ). Цэнтр працуе з моладдзю па шматлікіх кірунках, шырока выкарыстоўвае такія формы арганізацыі, як клубы (англійскі, французскі, італьянскі і нямецкі), творчыя секцыі («Мастацкая майстэрня», «Кінаадукацыя», «Творчая фатаграфія»), спецыяльныя праграмы («Зимний вечер в Зимнем дворце», «День мартовского кота» і інш.).

Для даступнасці азнаямлення наведвальніка з музейнымі калекцыямі і прадметамі, якія захоўваюцца ў музейных фондах, была вынайдзена адметная форма, якая набывае апошнім часам усё большую папулярнасць сярод насельніцтва — сістэма адкрытага захоўвання музейных фондаў. Не сакрэт, што на экспазіцыях і выстаўках дэманструецца зусім невялікая частка музейных збораў. Для таго, каб шэдэўры не пыліліся на паліцах і ў зачыненых шафах, ствараюцца ўмовы для даступнага агляду фондаў. Для Беларусі гэта навінка. Упершыню ў краіне ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі стала даступнай экспазіцыя адкрытага захоўвання археалагічных збораў. Замежны вопыт сведчыць пра шырокія магчымасці для правядзення разнастайных форм работы на такіх экспазіцыях для розных катэгорый насельніцтва.

Што прыцягвае наведвальнікаў у экспазіцыях адкрытага захоўвання, да якіх нярэдка большая цікавасць, чым да асноўных музейных экспазіцый? Дэманстрацыя прадметаў, якія не выстаўляліся раней, адметнасць калекцыйнага паказу... А магчыма, першасным з'яўляецца і іншы, псіхалагічны аспект — эфект навізны, жаданне ўбачыць тое, што доўгі час было схавана ад яго, наведальніка, тое, што, магчыма, ніколі і не з'явіцца ў традыцыйнай музейнай экспазіцыі? У адным з украінскіх музеяў для прыцягнення наведвальнікаў у сцяне фондасховішча былі выняты цагліны, праз адтуліны наведвальнікі атрымалі магчымасць заглядаць у фонды, запаўняць этыкеткі музейных прадметаў. Гэта была разавая акцыя, якая атрымала вялікі рэзананс. І хаця ўсе цагліны сёння на сваіх месцах, некаторыя музейныя эксперты і зараз упэўнена сцвярджаюць: «Музей — гэта храм, і вымаць з яго цагліны — блюзнерства».

***Пытанне асаблівай музейнай місіі рэгулярна ўзнімаецца музейнай грамадскасцю: музей — храм муз, поле культурных войн і рэвалюцый альбо гульнёвая пляцоўка, хто ў доме (музеі) гаспадар — кіраўнік, супрацоўнік-мадэратар ці наведвальнік?***

Пытанне асаблівай музейнай місіі рэгулярна ўзнімаецца музейнай грамадскасцю: музей — храм муз, поле культурных войн і рэвалюцый альбо гульнёвая пляцоўка, хто ў доме (музеі) гаспадар — кіраўнік, супрацоўнік-мадэратар ці наведвальнік? І калі яшчэ 5 гадоў назад большасць схілялася да прыярытэтаў у бок традыцыйнасці музейных функцый, то сёння пераважаюць адукацыйны і рэкрэацыйны аспекты, якія выкліканы ўключэннем музея ў русла цывілізацыйнага развіцця культуры. Прычым, не грамадства прыстасоўваецца да музея, як хацелася б класічнаму музею, а наадварот, музей шукае падыходы да пошуку сваёй аўдыторыі.

Азербайджанскі дзяржаўны музей мастацтваў (г. Баку) падчас рэалізацыі аднаго з праектаў пайшоў за наведвальнікам у прамым сэнсе слова. Колькасць наведвальнікаў у выхадныя дні пачала змяншацца і музей вырашыў арганізаваць Ноч музеяў у новым гандлёвым цэнтры, любімым месцы адпачынку большасці жыхароў горада, асабліва моладзі. Акцыя шырока рэкламавалася, як і дзейнасць музея, праз буклеты, банеры, рэкламныя ролікі. Мастакі новых плыняў прадставілі на выставу-продаж свае работы. Цікавасць да музея з боку моладзі і сямейных наведвальнікаў была надзвычайная. За Ноч музеяў было распрададзена 30 % выстаўленых карцін. А наведванне самаго музея пасля акцыі павялічылася. І таму прыход музея ў гандлёвы цэнтр са сваёй праграмай можна ацаніць як удалы маркетынгавы ход.

Не менш значнай з'яўляецца сёння адукацыйная роля музеяў у кантэксце сучаснай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У музейнай дзейнасці ўсё большае пашырэнне набываюць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, інавацыйныя формы работы з наведвальнікамі, актуалізацыя новых ведаў і музейных калекцый для розных катэгорый музейнай аўдыторыі. Разам з тым, павышаецца доля платных паслуг у адукацыйнай сферы. У беларускай музейнай рэчаіснасці музейна-педагагічныя праграмы яшчэ толькі пачынаюць асваенне культурнай прасторы. І толькі асобныя з іх прыносяць музеям не толькі маральнае задавальненне якасна выраблены прафесійным прадуктам. У Расіі пры Рускім музеі створаны прафесійны цэнтр музейнай педагогікі (г. Санкт-Пецярбург), які за гады сваёй дзейнасці набыў унікальны вопыт не толькі ў галіне стварэння прафесійных музейных прадуктаў, але і эфектыўных шляхоў прасоўвання тавараў і паслуг на міжнародны рынак.

> ***У многіх музеях краін СНД сёння адсутнічае сістэма шырокага і комплекснага ўзаемадзеяння з установамі адукацыі. Найчасцей яно адбываецца на ўзроўні асобных установаў і рэгіянальных акцый.***

На прыкладзе сваёй дзейнасці Расійскі цэнтр музейнай педагогікі пацвердзіў вядомы пастулат «Ідэалогіі дзяржавы па-за культурай быць не можа». Разам з тым, яго дзейнасць — выдатны прыклад прыцягнення спонсарскай дапамогі і рэгіянальных крыніц фінансавання праектаў. У рамках праекта «Прывітанне, музей» былі адкрыты 42 філіялы ў рэгіёнах Расійскай Федэрацыі. У 2011 г. у межах акцыі «Крок насустрач» створаны 6 рэгіянальных цэнтраў для дзяцей і падлеткаў з фізічнымі адхіленнямі. У музейна-адукацыйныя праграмы былі ўключаны педагогі, бацькі, музычныя калектывы, адукацыйныя і сацыяльныя ўстановы, прадстаўнікі адміністрацый рэгіёнаў, бізнес-структур і інш., якія пайшлі на актыўны кантакт з музейшчыкамі па прычыне высокай сацыяльнай ролі праектаў. Цэнтры-філіялы былі арганізаваны пры музеях і метадычных кабінетах. Вылучэнне адзінак для іх дзейнасці адбывалася на ўзроўні кіраўніцтва абласцей. Усё гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця рэгіянальных музеяў: кожны з іх атрымаў фінансавыя сродкі на ўкараненне музейных праграм і сацыяльных праектаў.

Асаблівае значэнне сёння атрымліваюць пытанні медыякультуры, інтэрнэт-тэхналогій у музейнай дзейнасці. Рускі музей 6 гадоў назад упершыню заявіў аб сабе дастаткова складанай структурай віртуальных філіялаў. Па-сутнасці, яна ўяўляе своеасаблівы электронны аналаг каталога калекцый Рускага музея. Наведвальнікі віртуальнага музея могуць прайсці з экскурсіяй па музею, убачыць карціны і інтэр'еры, ажыццявіць віртуальнае падарожжа ў прастору мастацкага твора. Віртуальны музей дазваляе наблізіцца да скарбніцы рарытэтаў, сумесных праектаў, жыцця музея на ўзроўні інтэрнэта (відэаканферэнцыі, мерапрыемствы, інтэрнэт-алімпіяды). На сённяшні дзень працуюць 93 цэнтры Віртуальнага музея: 64 — у Расіі, 29 — за мяжой (Украіна, Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Бельгія, Індыя, Славенія, Казахстан, Кітай і інш.), з іх 3 — на тэрыторыі Беларусі (Мінск, Гомель, Полацк). Сярод удзельнікаў праекта — музеі, бібліятэкі, універсітэты. Віртуальныя філіялы выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці навейшыя камп'ютарныя тэхналогіі і прадстаўляюць сабой новую ступень інтэграцыі ў сферы культуры ў адзінай культурна-інфармацыйнай прасторы.

Актуальным пытаннем музейнай камунікацыі з'яўляецца неабходнасць фарміравання візуальнай культуры, творчага мыслення, як музейных наведвальнікаў, так і супрацоўнікаў. Адсутнасць так званай «пастаноўкі вока» пазбаўляе чалавека здольнасці цэласна адлюстроўваць і бачыць. Той, хто не мае слыху, не можа быць музыкантам. Адсутнасць мастацкага, творчага выхавання ў сям'і і соцыуме нярэдка пазбаўляе здольнасці паўнацэнна ўспрымаць аб'екты культуры. І таму асаблівая роля ў выкананні гэтай задачы належыць музею. Менавіта таму не інфармацыйна-пазнавальная экскурсія павінна займаць цэнтральнае месца ў дзейнасці сучаснага музея, а іншыя формы камунікацыі — інтэрактыўныя праграмы, гульні, музейна-педагагагічныя заняткі, дыскусіі і інш. Прычым, далёка не заўсёды іх наяўнасць гарантуе з'яўленне якасна новых прафесійных падыходаў.

На першым плане — пытанне якасці музейна-педагагічных праграм, якія павінны быць паўнацэнным відам адукацыі асобы. Музейна-педагагічная праграма вылучаецца комплексным характарам, можа ўключаць блокі курсаў, якія забяспечваюць паслядоўнае і паэтапнае развіццё, выхаванне і навучанне асобы сродкамі музейна-педагагічных тэхналогій, на аснове музейных калекцый. Рэалізацыя музейна-педагагічных праграм дае магчымасць наведвальнікам-навучэнцам атрымаць шэраг актуальных уменняў і навыкаў — інтэрпрэтацыю і ацэнку зрокавых вобразаў, самастойнасць меркаванняў, асэнсаванне культурных дасягненняў грамадства, творчае ўспрыняцце акаляючага свету і інш. Да працы над музейнай праграмай, асабліва па арт-тэрапеўтычных методыках, прыцягваюцца розныя спецыялісты — сацыёлагі, псіхолагі, тэатральныя рэжысёры, мастацтвазнаўцы і інш. Удасканаленне і вызначэнне эфектыўнасці праграм адбываецца праз рэгулярную дыягностыку. Якасна выкананыя праграмы Расійскага цэнтра музейнай педагогікі сёння функцыянуюць у рынкавым фармаце, з захаваннем аўтарскіх правоў: з імі можна азнаёміцца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набыць электронны макет на дагаварной аснове.

У многіх музеях краін СНД сёння адсутнічае сістэма шырокага і комплекснага ўзаемадзеяння з установамі адукацыі. Найчасцей яно адбываецца на ўзроўні асобных устаноў і рэгіянальных акцый. Далёка не ва ўсіх музеях СНД ёсць такое цеснае супрацоўніцтва, як у нашай краіне, з аддзеламі адукацыі і абл(гар)выканкамаў, Камітэтам па адукацыі і іншымі структурамі. Разам з тым, нельга не адзначыць, што сёння супрацоўніцтва з установамі Міністэрства адукацыі адбываецца найперш шляхам аднабаковай прэзентацыі музейнага культурнага прадукту, у якасці якога найчасцей выступаюць экскурсіі і лекцыі, з адзінкавымі сумеснымі музейна-педагагічнымі праектамі. Прычын такога становішча некалькі. На першым месцы — недастатковае разуменне настаўнікамі і выкладчыкамі акадэмічнай школы адукацыйнай ролі музея: на сённяшні дзень у музеях яны бачаць найперш функцыі візуальнай прэзентацыі культурнай спадчыны і забаўлення (апошняй аддаецца перавага). Значным фактарам з'яўляецца і тое, што ўстановы адукацыі і музеі не абмяркоўваюць праблемы адукацыі і выхавання разам, кожны будуе праграму ўзаемадзеяння на аснове ўласных меркаванняў: музеі нярэдка не задумваюцца аб тым, што сапраўды патрэбна школе як установе адукацыі, а школа не бачыць рэальнай магчымасці павысіць узровень навучання праз музейныя праграмы. На сённяшні дзень музейная прастора не выкарыстоўваецца настаўнікамі-практыкамі як новая пляцоўка, на якой яны могуць атрымаць іншыя магчымасці для свайго пазіцыяніравання, новых падыходаў у выкладанні тэм школьнага і вузаўскага курсаў з дапамогай магчымасцей візуалізацыі культуры.

Аб'яднаць намаганні і стварыць унікальны культурна-адукацыйны прадукт — неабходная задача музеяў у перспектыве. У мэтах атрымання адваротнай сувязі аддзел навукова-метадычнага забеспячэння развіцця музейнай дзейнасці Інстытута культуры Беларусі сумесна з Міністэрствам культуры плануе правядзенне «круглага стала», на які будуць запрошаны кіраўнікі музеяў, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, настаўнікі школ, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў і спецыялісты ў галіне музейнай педагогікі.

На сучасным этапе неабходна распрацаваць сістэму комплекснага ўзаемадзеяння музеяў і ўстаноў адукацыі на ўзроўні сумеснай падрыхтоўкі і ўкаранення музейна-адукацыйных праграм. Удзел у падрыхтоўцы праграм дапаможа школе максімальна поўна выкарыстоўваць патэнцыял музея для творчага і інтэлектуальнага развіцця вучняў, адкрыцця новых магчымасцей і выкарыстання новых форм навучання. Створаныя на аснове музейных калекцый і крэатыўных тэхналогій, яны будуць садзейнічаць духоўнамаральнаму развіццю і фарміраванню творчага патэнцыялу падрастаючага пакалення.

Сведчаць аб важнасці адукацыі ў музейнай сферы і выніковыя рэкамендацыі, распрацаваныя для нацыянальных упраўленняў у сферы музейнай дзейнасці, міністэрстваў культуры, адукацыі, спорту і турызму краін СНД з мэтай удасканалення музейнай справы і з улікам адпаведнасці міжнародным стандартам:

— ажыццяўленне інфармацыйнага абмену паміж краінамі СНД праз стварэнне аб'яднаных інтэрнэт-рэсурсаў;

— умацаванне міжнародных партнёрскіх сувязей паміж музеямі краін СНД;

— развіццё міждысцыплінарных кантактаў музеяў са спецыялістамі іншых сфер, уключаючы турызм, адукацыю і ахову гісторыка-культурнай спадчыны;

— падрыхтоўка сістэмы комплекснага ўзаемадзеяння міністэрстваў на ўзроўні сумеснай дзейнасці па распрацоўцы і ўкараненні музейна-педагагічных праграм;

— садзеянне стварэнню сістэмы культурна-пазнавальных турыстычных маршрутаў па краінах СНД на базе нацыянальных і рэгіянальных музеяў.

Сярод іншых адметных прапаноў на перспектыву — стварэнне віртуальнага метадычнага кабінета краін СНД, карты музейнага турызму, увядзенне дыстанцыйнага навучання ў музейнай дзейнасці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

## Літаратура


1. *Управление* музеем — XXI век : комплект презентационных и учебных материалов проекта ЮНЕСКО // МФГС ; Бюро ЮНЕСКО в Москве. — М. : БЭСТ-принт, 2010. — С. 10.
2. *Бойко, А.* Роль музеїв в освіті та розвитку культурно-пізавального турізму / А. Бойко // Музейний простір. — Київ : Майстер книг, 2011. — № 2. — С. 44.
3. *Бойлан, Дж.* Управление музеем : практ. руководство / Д. Бойлан. — Mega Basim Yayin San. ve Tic, 2004. — С. VII.
4. *Нагорский, Н. В.* Музей в духовной жизни общества / Н. В. Нагорский. — СПб., 2004.

5. *Поляков, Т. П.* Музей будущего : проблема выбора модели / Т. П. Поляков // Теория и практика музейного дела в России на рубеже XX—XXI вв. ; Труды ГИМ. — М., 2001. — Вып. 127. — С. 76—85.

6. *Пономарев, Б. Б.* Музей как коммуникационная система : проблема гармонизации историко-культурного и информационно-деятельностного компонентов / Б. Б. Пономарев ; автореф. ... на соискание учен. ст. канд. культурологии. — Краснодар, 2002.

7. *Сапанжа, О. С.* Стратегии коммуникационных процессов в контексте модернизации музейной деятельности / О. С. Сапанжа // Триумф музея? сб. науч. тр. — СПб. : «Осипов», 2005. — С. 160—171.

8. *Селиванов, Н. Л.* Субъективный взгляд на музей из виртуальной реальности / Н. Л. Селиванов // Музей и новые технологии. — М. : Прогресс-Традиция, 1999. — С. 198—205.

9. *Хадсон, К.* Влиятельные музеи. / К. Хадсон. — Новосибирск : Сибирский хронограф, 2001.

10. *Шляхтина, Л. М., Мастеница, Е. Н.* Проективная модель музея в XXI веке : управление процессом коммуникации / Л. М. Шляхтина, Е. Н. Мастеница // Музейныя зритель. XXI век. Материалы междунар. конф. — СПб., 2006. — С. 24—30.

11. *Щепеткова, И. А.* Музей : метаморфозы театральности / И. А. Щепеткова. — СПб. : Знак, 2005.

## Summary

Questions of the development strategy of development of Museum Affairs and the generalization of the recommendations of the first expert meeting of leading Museum specialists of the CIS countries «the Role of museums in education and development of cultural-cognitive tourism» are considered in the article. Considerable attention is given to the problems of introduction of innovative practices in the Museum activity, creation of necessary infrastructure for the development of the Museum tourism, formation of visual culture, the development of an integrated system of interaction between museums and educational institutions.

**А. Б. Сташкевич**

# Дидактические выставки музеев как экспозиционный проект и образовательный продукт

*В статье речь идет об одном из перспективных направлений музейной деятельности — создании дидактических выставок. Автор исследует их типологию и раскрывает специфику в контексте коммуникативной и образовательной функций музея.*

Современный музей немыслим без определения своей социальной роли и реализации образовательной миссии, направленной на передачу знаний о музейных предметах и коллекциях. Роль музейного образования в обществе растет. Об этом свидетельствуют данные статистики, отражающие рост интереса различных групп населения к музейным программам и образовательным проектам. Музей из хранилища ценных вещей постепенно, но поступательно превращается в крупный информационный центр, аккумулирующий социально значимые знания и опыт поколений, без постижения которых воспитание молодых людей было бы неполноценным. И хотя музей — это не школа и не университет, главная его цель иная, чем простое освоение знаний; она скорее находится в плоскости наследственных категорий и выражает идею сохранения и передачи коллективной памяти. Однако музей, став публичным институтом, не может стоять в стороне от процессов, происходящих в обществе и от тех требований, которые оно ему предъявляет по воспитанию будущих поколений.

Сегодня образовательные проекты и программы стали визитной карточкой многих музеев, они вносят разнообразие в привычный ритм этих учреждений, делают их ближе к публике, и являются рефлексией на те процессы и явления, которые происходят в мире и обществе. Среди многообразия форм и методов работы музея с аудиторией, довольно интересной и, по сути, малоисследованной формой является дидактическая выставка.

Понятие «дидактическая выставка» в музеологическом дискурсе появилось сравнительно недавно. В связи с этим существуют несколько дефиниций, отражающих различные подходы к пониманию данной проблемы. С точки зрения практической музеографии, предполагающей, что музейная экспозиция или выставка должна основываться на музейных предметах и что именно последние определяют само существование музейной презентации, все имеющиеся дефиниции в конечном счете можно свести к двум основным значениям: 1) под дидактической выставкой понимают любое созданное образовательное пространство в музее, при этом

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ